# «НІЯКІЯ МЕЖЫ БОЛЬШ НЕ ПАДЗЕЛЯЦЬ НАШУ РОДНУЮ ЗЯМЕЛЬКУ — БЕЛАРУСЬ»

**Менавіта гэтымі словамі — шчырымі, па-народнаму цёплымі, радаснымі — нашы папярэднікі-«звяздоўцы» віталі дзень, які стаў пачаткам яднання беларусаў на сваёй зямлі. Гэтыя словы — у агульным загалоўку, пад якім выйшаў нумар «Звязды» ўжо назаўтра пасля пачатку вызваленчага паходу Чырвонай арміі і які практычна цалкам быў прысвечаны тэме народнага яднання...**


Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Комуністычная партыя (большавікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК І МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б
№215 (6482) | 18 верасня 1939 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

СОВЕЦКІ ЎРАД АДДАЎ РАСПАРАДЖЭННЕ ГАЛОЎНАМУ КАМАНДВАННЮ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ДАЦЬ ЗАГАД ВОЙСКАМ ПЕРАЙСЦІ ГРАНІЦУ І ЎЗЯЦЬ ПАД СВАЮ АБАРОНУ ЖЫЦЦЁ І МАЕМАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЫ І ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

НАШ СВЯШЧЭННЫ АБАВЯЗАК ПАДАЦЬ РУКУ ДАПАМОГІ СВАІМ БРАТАМ—БЕЛАРУСАМ І УКРАІНЦАМ, НАСЯЛЯЮЧЫМ ПОЛЬШЧУ, ВЫЗВАЛІЦЬ ІХ АД ПАНСКАГА СВАВОЛЛЯ, НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПРЫГНЕЧАННЯ І ЭКСПЛААТАЦЫІ.

НІЯКІЯ МЕЖЫ, НІЯКІЯ ПАГРАНІЧНЫЯ СЛУПЫ БОЛЬШ НЕ ПАДЗЕЛЯЦЬ, НЕ ПАСЯКУЦЬ НА ЧАСЦІ НАШУ РОДНУЮ ЗЯМЕЛЬКУ-БЕЛАРУСЬ

Спачатку мы хацелі прысвяціць гэтаму нумару публікацыю-агляд. Але, самі яго з цікавасцю пагартаўшы — уважліва пачытаўшы, — вырашылі, што найлепш будзе апублікаваць яго факсіміле. Такі вось падарунак сённяшнім чытачам — газета, якая выйшла восемдзясят два гады назад. Гэткі кавалачак жывой гісторыі — і яна сапраўды паўстае на тых старонках, і пачынаеш ведаць тое, чаго не ведаў, асэнсоўваць тое, над чым не задумваўся. Калі хтосьці яшчэ сумняваецца, што 17 верасня 1939 года — дата для нашага народа лёсавызначальная, пачытайце сённяшні нумар. Дакладней, не сённяшні, а той, які дайшоў да нас з 18 верасня 1939-га.

Дарэчы, даваенныя газеты ўвогуле — вялікая рэдкасць: газетная папера гарыць найлепш, а Беларусь тры гады акупацыі і бітваў за яе літаральна палала. Больш-менш поўныя даваенныя падшыўкі «Звязды» ёсць у Нацыянальным архіве ды ў Нацыянальнай бібліятэцы. Нацыянальная бібліятэка некалькі гадоў назад распачала вельмі важную справу — алічбаванне даваенных газет. Мы звярнуліся туды з просьбай падзяліцца лічбавай версіяй «Звязды» верасня 1939 года. Дзякуючы руплівцам галоўнай кніжнай скарбніцы краіны кожны чытач сённяшняга нумара можа даведацца пра тагачасныя падзеі з першых вуснаў. Або, правільней сказаць, з першых радкоў.

СТАР. 3